УДК 316.334

*С. В. Венідзіктаў*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*(Беларусь)*

# МЕДЫЯКАМУНІКАТЫЎНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА АСОБЫ

*У артыкуле прааналізаваны змест і структура медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці асобы ў кантэксце магчымых пагроз спажывання масавай інфармацыі. Раскрыта сутнасць базавых метадаў і тэхналогій вербальнага маніпуліравання свядомасцю масавай аўдыторыі. Прыведзены практычныя рэкамендацыі па індывідуальным выяўленні схаванага маўленчага ўздзеяння ў сродках масавай інфармацыі. Паказана, што развіццё медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці асобы з'яўляецца важным рэсурсам забеспячэння яе інфармацыйнай бяспекі.*

Паняцце *камунікатыўнай кампетэнтнасці* ў максімальна шырокім сэнсе можа быць разгледжана ў суадносінах са ступенню авалодання асобай разнастайнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, неабходнымі для пабудовы эфектыўнай сістэмы ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем. На першы план у падобнай інтэракцыі выходзіць знакавае ўзаемадзеянне, якое ажыццяўляецца ў вербальнай і невербальнай формах і дазваляе індывіду як трансліраваць звесткі аб сабе, так і спажываць інфармацыю звонку.

Больш шырокае паняцце *медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці* апісвае базавыя камунікатыўныя навыкі асобы, адаптаваныя да ажыццяўлення розных форм узаемадзеяння з медыяпрасторай: спажывання прадукцыі масмедыя, самастойнага пошуку інфармацыі, выбару тых ці іншых рэсурсаў для рэгулярнага спажывання, фарміравання ўласнага меркавання адносна якасных характарыстык кантэнту СМІ, стварэння ўласнага кантэнту і г. д. Агульнае развіццё гэтых і іншых кампетэнцый прадвызначае анталагічнае становішча асобы ў сучаснай «лічбавай» рэальнасці.

У сістэме і камунікатыўнай, і медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці асобы вылучаюцца:

а) уменне арганізоўваць і ажыццяўляць камунікацыю на розных узроўнях (індывідуальным, міжасобасным, групавым, масавым);

б) здольнасць адэкватна ўспрымаць атрыманую ў працэсе камунікацыі інфармацыю (узровень разумення);

в) навыкі стварэння і распаўсюджвання інфармацыі;

г) накіраванасць на мінімізацыю магчымых скажэнняў спажываемай і тыражаванай інфармацыі;

д) здольнасць супрацьстаяць мэтанакіраванаму маніпуліраванню з боку іншых удзельнікаў камунікатыўнага акту.

Такім чынам, медыякамунікатыўную кампетэнтнасць можна разглядаць у кантэксце пагроз спажывання знешняй (масавай) інфармацыі: мэтанакіраванага або стыхійнага дэструктыўнага ўздзеяння на асобу з дапамогай інфармацыйна-псіхалагічных метадаў. Асноўныя інструменты падобнага ўплыву ў публічным дыскурсе лакалізаваны на вербальным узроўні камунікацыі і рэалізуюцца праз канструіраванне пажаданага для маніпулятара вобразу рэальнасці ў свядомасці масавай аўдыторыі. Паведамленні ў сродках масавай інфармацыі, публікацыі ў сацыяльных сетках, мэсанджарах, каментарыі і іншыя формы рэакцыі, шматразова ўзмоцненыя з дапамогай візуальных крыніц і тыражыравання навязваемых меркаванняў, здольныя прывесці да ўзмацнення інфармацыйнай энтрапіі, дэфрагментацыі камунікатыўнай прасторы, каштоўнаснай дэзарыентацыі масавай аўдыторыі, праяўлення дэструктыўных форм сацыяльнай актыўнасці.

Пад *вербальнай маніпуляцыяй* разумеецца «разнавіднасць маніпулятыўнага ўздзеяння, якое ажыццяўляецца шляхам выкарыстання <...> пэўных рэсурсаў мовы з мэтай схаванага ўплыву на кагнітыўную дзейнасць адрасата і яго паводзіны» (пераклад наш. — *С. В.*) [1, с. 25]. А. В. Чарняўская сцвярджае, што асноўная мэта маўленчай маніпуляцыі — «выклікаць у адрасата неабходнае маніпулятару стаўленне да аб’екта незалежна ад жаданняў і інтарэсаў самога адрасата. Апошні, у сваю чаргу, не павінен распазнаць гэтую камунікатыўную ўстаноўку» (пераклад наш. — *С. В.*) [цыт. па: 2, с. 24].

Гаворачы аб выкарыстанні схаванай вербальнай маніпуляцыі ў медыядыскурсе, даследчыкі ўжываюць паняцце *моўнага гвалту* — «неаргументаванага або недастаткова аргументаванага вербальнага ўздзеяння на рэцыпіента, мэта якога — змяненне яго асобасных установак (ментальных, ідэалагічных, ацэначных і г. д.)» (пераклад наш. — *С. В.*) [3, с. 97]. Падобны схаваны ўплыў на аўдыторыю звязаны з распаўсюджваннем сацыяльна-палітычных міфалагем, маўленчых штампаў, эўфемізмаў (слова або выраз, якое замяняе іншае, нязручнае для дадзенай сітуацыі або грубае) і дысфемізмаў (грубае або непрыстойнае абазначэнне першапачаткова нейтральнага паняцця), выкарыстаннем іранізацыі, дэманізацыі, іранічнага пазіцыяніравання. Гэтыя і іншыя маўленчыя сродкі фарміруюць у свядомасці рэцыпіентаў устойлівыя невербальныя выявы, якія замацоўваюцца за аб’ектамі/з’явамі аб’ектыўнай рэальнасці і прадвызначаюць стаўленне да апошніх.

Маніпуляцыя ў прасторы масавай камунікацыі можа прымаць розныя формы: ад эпізадычнага скажэння паведамленняў з дапамогай клікбейт-

тэхналогій — да расцягнутай у часе стратэгіі кансцыентальнай агрэсіі праз паслядоўную трансфармацыю публічнага дыскурсу [4]. Элементарным прыкладам уплыву першага тыпу служаць эмацыянальна афарбаваныя, «шумлівыя» загалоўкі ў медыя, якія прываблiваюць аўдыторыю сенсацыйнасцю, эксклюзіўнасцю, уяўнай карыснасцю інфармацыі («Сталі вядомыя антычныя рэцэпты даўгалецця», «Мафіёзныя структуры абвясцілі вайну паліцыі», «Універсальны спосаб разбагацець на біржы» і да т. п.). Кансцыентальная агрэсія з'яўляецца адным з метадаў вядзення інфармацыйна-псіхалагічнай вайны, мае на мэце змяненне свядомасці масавай аўдыторыі і кіраванне ёю, часта папярэднічае традыцыйным, «гарачым» ваенным дзеянням (так было ў Сербіі ў 1990-х, у арабскіх дзяржавах у 2010-х гг. і г. д.) [5].

Паміж досыць простымі метадамі маўленчага ўздзеяння (клікбейт, лістыкл і да т. п.) і складанымі палітычна абумоўленымі тэхналогіямі знаходзіцца шэраг іншых вербальных тэхнік маніпуляцыі, здольнасць распазнаваць якія ў значнай ступені прадвызначае ступень індывідуальнай інфармацыйнай устойлівасці асобы [5, с. 40]. Напрыклад, стварэнне маніпулятарам жаданага метафарычнага поля ў дачыненні да вызначанага аб'екта прымушае аўдыторыю ўспрымаць навіны аб ім у зададзеным эмацыянальным рэчышчы, а маўленчае канструіраванне вобраза ворага прыводзіць да ўкаранення яго характарыстык (нават далёкіх ад рэальных) у масавай свядомасці. Стэрэатыпізацыя мыслення аўдыторыі аўтаматычна змяншае яе ўстойлівасць да ўнушэння, фарміруе ўстаноўку на нерэфлексіўнае прыняцце штампаў як адзіна дакладных трактовак рэальнасці.

Рэсурсам забеспячэння інфармацыйнай бяспекі асобы ва ўмовах знешняга ўплыву, такім чынам, становіцца фарміраванне медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці, што прадугледжвае развіццё маўленчай культуры (для выяўлення вербальных маніпулятыўных канструкцый) у каардынацыі з удасканаленнем агульнай медыяінфармацыйнай граматнасці (культура ўсвядомленага спажывання медыякантэнта, аналізу яго зместу, самастойнага прадуцыравання і тыражыравання). Агульныя практычныя рэкамендацыі ў сувязі з гэтым могуць быць зведзены да наступных:

1) выкарыстанне тэхнік і адкрытых сеткавых рэсурсаў фактчэкінга, якія дазваляюць развіць крытычнае мысленне і культуру спажывання медыйнага кантэнта (у першую чаргу — сеткавага) — т. зв. *інфармацыйную гігіену*;

2) ацэнка крыніцы інфармацыі, асобы аўтара (аўтараў) і магчымых мэт размяшчэння звестак;

3) праверка медыятэкстаў на наяўнасць спасылак на іншыя крыніцы, якія пашыраюць аб'ём звестак аб падзеі або прапануюць альтэрнатыўную трактоўку;

4) вывучэнне паведамленняў цалкам з ацэнкай як іх зместу, так і пасылу, які змяшчаецца ў загалоўку (праверка на наяўнасць клікбейта) і ва ўступнай частцы (лідзе), чытаннем якой нярэдка абмяжоўваецца спажыванне навіны;

5) ацэнка ступені эмацыянальнай нагружанасці паведамлення: апеляцыя да пачуццяў аўдыторыі праз маўленчыя канструкцыі з'яўляецца распаўсюджаным метадам маніпуліравання свядомасцю;

6) канцэнтрацыя ўвагі на арфаграфічнай, лексічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці тэксту: памылкі, недакладнасці друку, няўзгодненасць тэксту могуць сведчыць і аб недастатковай кампетэнтнасці аўтара, і аб выкарыстанні ім розных сеткавых рэсурсаў для генерыравання паведамленняў.

Такім чынам, асноўнай мэтай выкарыстання вербальных інструментаў схаванага ўздзеяння на аўдыторыю медыя з'яўляецца стварэнне выгаднай для маніпулятара карціны свету ў свядомасці рэцыпіентаў і зніжэнне іх здольнасці да крытычнага мыслення, стварэнне ілюзіі свабоднага выбару. У гэтым кантэксце развіццё медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці асобы, што выражаецца ў здольнасці выяўляць маніпуляцыі і супрацьстаяць ім, становіцца фактарам забеспячэння яе інфармацыйнай бяспекі. Індывідуальная ўстойлівасць да магчымых праяў дэструктыўных з'яў у медыяінфармацыйнай сферы з такога пункту гледжання становіцца важкім фактарам агульнай інфармацыйнай бяспекі грамадства і дзяржавы.

1. Копнина Г. А. Речевое манипулирование : учеб. пособие. М. : Флинта : Наука, 2017. 170 с. Вернуться к статье

2. Звада О. В. Манипулятивные особенности политического дискурса в англоязычных СМИ // Вестн. Волж. ун-та им. В. Н. Татищева. 2018. № 1. Т. 1. С. 23–30. Вернуться к статье

3. Зарипов Р. И. Метафорическое манипулятивное воздействие как элемент информационной войны // Вопросы психолингвистики. 2015. № 1 (23). С. 95–106. Вернуться к статье

4. Венидиктов С. В. Искажение медиареальности: технологии манипулирования и стратегии противодействия : моногр. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2022. 192 с. Вернуться к статье

5. Венідзіктаў С. В. Ад чутак — да дыпфэйкаў. Інструменты маніпуліравання ў медыяпрасторы // Thesaurus : зб. навук. пр. / Магілёўскі ін-т МУС. Магілёў, 2022. Вып. XI : Гістарычныя і палітычныя навукі. С. 38–46. Вернуться к статье

S. V. Venidziktau

**Media communicative competence and information security of the person**

The article analyzes the content and structure of a person's media communicative competence in the context of possible threats of mass information consumption. The content of the basic methods and technologies of verbal manipulation of the consciousness of a mass audience is disclosed. Practical recommendations for individual identification of hidden

speech impact in the media are given. It is shown that the development of a person's media communicative competence is an important resource for ensuring its information security.